Самахвалаў, Д. С. Нацыянальная гісторыя як феномен гістарычнай думкі / Д. С. Самахвалаў // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. Вып. 5 / Рэдкал. У. Н. Сідарцоў (адк. рэд.), С.М. Ходзін (нам.адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БГУ, 2009. – С. 63–68.

**Д. С. САМАХВАЛАЎ**

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ ЯК ФЕНОМЕН ГІСТАРЫЧНАЙ ДУМКІ

У сучаснай гістарыяграфіі няма адзінага вызначэння паняцця «нацыянальная гісторыя». Але большасць вучоных схіляюцца да думкі, што нацыянальная гісторыя ўяўляе сабой складаную сістэму адлюстравання мінулага. Яна ўключае ў сябе два важных узаемадапаўняльных элемента: па-першае, наяўнасць пэўнага ўяўлення пра месца і ролю той ці іншай нацыі і, па-другое, апісанне гістарычных падзей з пункту гледжання дадзенага ўяўлення[i]. Гэта азначае, што гісторык, які даследуе праз прызму нацыянальных поглядаў, не абмежаваны толькі этнічнай гісторыяй, гісторыяй культуры і дзяржаўнасці. Ён мае магчымасць працаваць на шырокім даследчым полі. Аднак наяўнасць прынцыпаў і поглядаў, што абапіраюцца на сапраўдныя і ілюзорныя каштоўнасці нацыянальнай свядомасці, у выніку вызначаюць сутнасць гістарычнага апісання, метадалогію і метады яго даследавання.

Большасць гістарыёграфаў шукаюць генезіс нацыянальнай гісторыі ў філасофіі Асветніцтва, якая стварыла саму ідэю нацыі. Але як феномен гістарычнай думкі яна сфарміравалася некалькі пазней — у XIX — пачатку XX ст. Гэтаму садзейнічалі шырокае распаўсюджанне ідэалогіі нацыяналізму сярод еўрапейскіх інтэлектуалаў, станаўленне нацыянальных дзяржаў і агульнадзяржаўных інстытутаў, у тым ліку адзінай для кожнай краіны сістэмы адукацыі.

Было б натуральна меркаваць, што гісторыяпісанне, з пункту гледжання асобнай нацыі, толькі адзін з этапаў развіцця гістарычнай навукі, што рана ці позна яно будзе выціснута з акадэмічных колаў у разрад калянавуковай палемікі. «Нацыі маюць сваю асабістую гісторыю і яе бачанне, заснаванае на іх праве, але існуе агульнае мінулае, таксама які мінулае, якое звязвае іх з іншымі нацыямі. Цяжка ўявіць, што нейкая нацыя



можа разглядацца зусім ізалявана», — заўважае Р. Бьорк[ii]. Метадалагічныя абмежаванні нацыянальна-цэнтрычнага погляду павінны былі скіраваць вучоных у рэчышча агульных тэорый развіцця ці альтэрнатыўных варыянтаў разгляду мінулага. Аднак гэтага не адбылося.

Нацыянальная гісторыя цудоўным чынам перажыла ўсе выклікі XXст. і існуе да гэтай пары. Прыкладам таму з’яўляецца савецкая марксісцкая гістарыяграфія. Здавалася б, выкарыстанне марксісцкіх тэорый з іх ідэямі гуманізму, інтэрнацыяналізму і агульнай тэорыяй паэтапнага развіцця грамадства павінна было адсунуць нацыянальную ідэю. Замест гэтага савецкія ідэолагі ад гісторыі ішлі на перагляд ці нават спрашчэнне марксізму на карысць фарміравання асабістага савецкага погляду на тыя ці іншыя падзеі мінулага, часта вельмі адрозныя ад марксісцкіх гістарыяграфій іншых краін. Пасля распаду СССР у былых савецкіх рэспубліках, у тым ліку на Беларусі, пачалі актыўна распрацоўвацца «нацыянальныя канцэпцыі». Падобная сітуацыя склалася і ў іншых краінах, дзе «імперская» і «паслякаланіяльная» традыцыі хутка набывалі рысы нацыянальных.

У пасляваенную эпоху з’яўляюцца новыя гістарыяграфічныя плыні. Глабальны, антрапалагічны, новы расавы, псіхалагічны, мікра- і гендэрны падыходы павінны былі ператварыцца ў альтэрнатыву нацыянальнаму. У некаторай ступені так яно і было. Але паступовa нацыянальная гісторыя адаптавалася да іх. Больш за тое, сёння да месца вы- карыстанне такіх паняццяў, як «нацыянальная гендэрная» ці «нацыянальная сацыяльная» гісторыі. Рэгіянальная кааперацыя і глабалізацыя выклікалі патрабаванні інтэлектуалаў у стварэнні наднацыянальных (напрыклад, агульнаеўрапейскай ці панафрыканскай) канцэпцый. Аднак іх распрацоўшчыкі з самага пачатку вымушаны запазычваць менавіта вопыт нацыянальнай гісторыі.

Гістарыёграфы звычайна пагаджаюцца з тым меркаваннем, што нацыянальная гісторыя існуе дзякуючы самім нацыям. Упершыню ідэя нацыі як адзінай злучнасці ўсяго насельніцтва краіны была выказана падчас Вялікай Французскай рэвалюцыі і супрацьстаўлялася грамадству манархічнай дзяржавы, падзеленнаму па саслоўнаму, рэлігійнаму і генеалагічнаму чыннікам. Некалькі пазней з’явілася ідэя нацыі, якая абапіралася на агульнае этнічнае паходжанне, блізкасць мовы і культуры[iii]. Але ў абодвух выпадках нацыя будавалася па прынцыпу наяўнасці шчыльнай сацыяльнай арганізацыі з цеснымі ўнутранымі камунікацыйнымі сувязямі.



Для аб’яднання вялікай колькасці людзей, падзеленых гендэрна, прафесійна, маёмасна, рэгіянальна, а

часам і юрыдычна, павінна была існаваць агульная тоеснасць, якая ператварала масу насельніцтва ў сацыяльны арганізм. Для набыцця гэтай тоеснасці ў нацыянальных дзяржавах былі распрацаваныя адзіныя ці вельмі блізкія адна да другой ма- дэлі адукацыі, выхавання і самавыяўлення. Аднак пры гэтым ідэолагі клапаціліся і пра тое, каб факт выбару нацыянальнай тоеснасці абапіраўся на прывабнасць нацыянальных каштоўнасцяў. Кожная нацыя імкнулася сфарміраваць свой знешні выгляд і падкрэсліць характэрныя толькі дляяе ўласцівасці.

У гэтым сэнсе гісторыя, якая захоўвала і прадстаўляла інфармацыю аб мінулым народу, заўсёды цікавіла нацыяналістаў. Яна давала шырокія магчымасці як для канструіравання карціны «вялікай мінуўшчыны», так і для замацавання «гістарычна склаўшыхся» адносін. Пры гэтым палітычная гісторыя не проста служыла летапісам, а дапамагала асэнсаваць працягласць, ролю, функцыі і ўплыў таго ці іншага народа ці дзяржавы. Эканамічная і сацыяльная гісторыя — іх адметныя рысы. Нарэшце, культурная гісторыя малявала само аблічча нацыі. Не дзіва, што гісторыя ў працах нацыянальна арыентаваных публіцыстаў з’яўляецца перш за ўсё полем бітвы за нацыянальную тоеснасць. «Нацыяналісты выкон- валі важную ролю ў фарміраванні нацый не як мастакі-кулінары ці сацыяльныя інжынеры, але як палітычныя археолагі, якія нанава даставалі на паверхню і нанава тлумачылі агульнае мінулае, каб узнавіць грамадства», — кажа на гэты конт Энтані Сміт[iv].

Прафесійныя гісторыкі, як прадстаўнікі інтэлектуальных колаў, таксама былі ўцягнуты ў працэс фарміравання нацыянальнай тоеснасці. У гэтай сувязі можна адзначыць ролю Ф. Гізо, Ф. Шлегеля, Э. Лавіса, Т.Масарыка, М. Доўнар-Запольскага, М. Гаміо і іншых гісторыкаў, якія імкнуліся актыўна ўплываць на нацыянальны светапогляд сваіх народаў. Для іх было натуральным і нават неабходным апісанне гісторыі з нацыянальнага пункту гледжання.

Аднак нават сёння нацыянальны погляд пераважае ў гістарыяграфіі многіх краін. Так, пры разглядзе гісторыі Арменіі націск робіцца на тое, што армянскі народ першым прыняў хрысціянства і ніколі не адмаўляўся ад гэтай рэлігіі, армяне маюць арыгінальны алфавіт, а армянскія культурныя дзеячы шмат зрабілі для асветніцтва іншых народаў: персаў, сірыйцаў, грузін і нават індыйцаў. Гістарыяграфія Велікабрытаніі шмат надае ўвагі Хартыі вольнасцяў і прамысловаму перавароту XVIIIст.



Шведскія гісторыкі абавязкова адзначаюць, што ў XVII—XVIII ст. іх краіна адыгрывала ролю еўрапейскай звышдзяржавы. Амерыканскія — ганарацца першай у свеце Канстытуцыяй.

Уплыў нацыяналізму таксама можна заўважыць у імкненні паказаць сваю нацыю як традыцыйна дзяржаўную. Напрыклад, армянскія гісторыкі адносяць старажытную дзяржаву Урарту, ці сярэднявечную Кілікію, дзе сапраўды кіравала армянская дынастыя, менавіта да армянскіх нацыянальных утварэння[v], ігнаруючы пры гэтым іх шмат ці нават пазаэтнічны характар. Гісторыкі Узбекістана абвяш чаюць самастойнасць узнікнення ўзбекскай дзяржаўнасці на «базе прагрэсу старажытнай цывілізацыі» і такім чынам прыстасоўваюць да яе нават тыя дзяржавы Сярэдняй Азіі, у якіх цюркскі элемент не існаваў ці не адыгрываў вызначальнай ролі[vi]. Не менш яскравым прыкладам з’яўляюцца спрэчкі беларускіх і літоўскіх навукоўцаў вакол Вяліка- га княства Літоўскага.

Часам фарміраванне нацыянальнай канцэпцыі, якая імкнецца звязаць падзеі мінулага і надаць ім пэўны сэнс з пункту гледжання сённяшняга, прыводзіць да дзіўнай трансфармацыі гістарычнага кантэксту. М.Фера прыводзіць прыклад з краінамі Карыбскага рэгіёна, дзе насельніцтва — нашчадкі былых афрыканскіх рабоў і закантрактаваных рабочых з Еўропы, Індыі, Кітая і Інданезіі. Яно не мае агульных культурных каранёў, таму мясцовыя аўтары падручнікаў малююць гісторыю як пе- раўтварэнне былых рабоў у грамадзян свету, якія маюць адпаведную перавагу ў прыналежнасці да ўсіх чалавечых культур. «Гісторыя рабства падаецца такім чынам, — заўважае М. Фера, — што чорнае дзіця з Ямайкі меней спачувае лёсу сваіх продкаў, чым лёсу няшчасных англічан, якіх адпраўлялі ў Італію у часы Цэзара і якія першыя былі рабамі»[vii].

Мне б не хацелася ісці ўслед за Э. Смітам і казаць толькі пра міфалагізацыю гістарычнага мінулага розных нацый для нацыянальных патрэб. Размова хутчэй ідзе пра пошук унікальнасці аб’екту даследавання праз злучэнне мінулага з сучаснасцю. Гісторык, які прэзентуе мінулае толькі як праекцыю сучаснага, непазбежна абмяжоўвае сябе ў тлумачэнні адбыўшыхся падзей. Нацыянальны гісторык спрабуе абыйсці гэты хіб і свядома ці несвядома імкнецца яшчэ прэзентаваць і сучаснае як праекцыю мінулага. Гэтая праца падобная на зачараванае кола. Але менавіта яна стварае вядомыя нам вобразы гісторыі: «паспяховую» амерыканскую, «трагічную» армянскую ці польскую, «культурна накіраваную» індыйскую іг.д.



Такім чынам, нацыянальная ідэя з’яўляецца фундаментам нацыянальнай гісторыі. Аднак гэта мала тлумачыць яе доўгатэрміновае існаванне ў акадэмічных колах. Таму важным падаецца разгляд узаемаадносін нацыянальнай гісторыі і навуковых тэорый.

Як было заўважана вышэй, нацыі не існуюць у замкнёнай прасторы. Для высвятлення іх адметнасці заўсёды патрэбна параўнанне. Перш за ўсё з суседзямі, якія насяляюць тэрыторыі з адносна блізкімі

геаграфічнымі і кліматычнымі ўмовамі або звязаныя з імі культурна ці этнічна. Параўнанне павінна быць накіравана не проста на высвятленне «нацыянальнага характару», у існаванне якога значная колькасць сур'ёзных даследчыкаў проста не верыць[viii]. Яно павінна дапамагчы ўбачыць «адхіленні» ад «заканамернага» развіцця, для таго каб потым патлумачыць сітуацыю, якая складзецца.

Менавіта для пошукаў заканамернасцяў нацыянальна скіраваныя гісторыкі і карыстаюцца агульнымі тэорыямі. Нездарма рост папулярнасці нацыянальнай гістарыяграфіі супадае па часе з развіццём ідэй пазітывізму, які, з аднаго боку, падпарадкоўваў сацыялогію, а з другога абяцаў сфармуляваць агульныя законы развіцця грамадства. Важным фактарам было і тое, што пазітывізм даваў магчымасць междысцыплінарнай кааперацыі. Можна прыгадаць, што XIX ст. — гэта таксама час узнікнення эвалюцыяністскай канцэпцыі і расавых тэорый.

У некаторых краінах, такіх як Вялікабрытанія, працяглы перыяд існавала імперская традыцыя апраўдання каланіяльных захопаў у іншых частках свету цывілізатарскай місіяй белага чалавека. У дамешку з расавымі тэорыямі атрапасацыялогіі XIX ст. такая палітыка часткова знайшла сваё апраўданне, хаця і не магла патлумачыць, напрыклад, войны ў амерыканскіх калоніях ці сутыкненні з іншымі каланіяльнымі дзяржавамі. Іншыя канцэпцыі прапаноўвалі свой погляд на заканамернаці сацыяльнага развіцця. У іх святле краіна-каланізатар выглядала не проста як заваёўнік, а як актыўны знешні фактар, што прымушаў выйсці на новы ўзровень грамадскіх адносін. У некаторым сэнсе каланізатар ператвараўся ў добрую маці, якая несла з сабою новыя сучасныя веды, адукацыю і магчымасць удзельнічаць у сусветным падзеле працы. Тое, што існавала да яго прыходу, малявалася як працяглая спячка. Нават у дачыненні да ЗША рабілася выснова, што дэмакратычны лад у гэтай краіне быў заснаваны дзякуючы брытанскай юрыдычнай сістэме[ix].

У СССР распаўсюджванне марксізму таксама дало новыя магчымасці для параўнанняў развіцця Расіі з заходнімі краінамі. Гэта выклікала пэў-



ныя дыскусіі аб характары расійскага самадзяржаўя, формах вытворчых адносін і класавай стратыфікацыі, але трэба прызнацца, што яны вяліся на дастаткова высокім узроўні. Германская нацыянальная гістарыяграфія паспяхова перажыла шэраг метадалагічных крызісаў, у ходзе якіх выпрацоўваліся новыя формы тлумачэнняў прычын гістарычных падзей. Сёння да гэтых тэорый дадаюцца ідэі каланіялізму-посткаланіялізму і прагрэсіўнай ролі дэмакратыі. Яны загадзя вызначаюць норму і быццам бы прызначаны шлях гістарычнага развіцця, што робіць іх асабліва прыдатнай глебай для далейшага выкарыстання нацыянальнай гісторыяй.

Такім чынам, нацыянальная гісторыя заснавана на нацыянальнай ідэалогіі, але актыўна эксплуатуе агульныя канцэпцыі тлумачэння грамадскіх адносін, а таму, пакуль існуюць абагульняючыя тэорыі і спробы навязвання гісторыкам пэўных парадыгмаў развіцця, нацыянальная гісторыя не можа быць канчаткова выціснута іншымі напрамкамі. Хутчэй за ўсё, яна здолее перажыць і крызіс самой ідэі нацыі як сацыяльнай злучнасці, будзе трансфармавана і працягне сваё існаванне на новым узроўні.

---

[i] *Lonroth E.*Introduction // Conceptions of National History: Proceedings of Nobel Symposium. Stockholm : Walter de Gruyter, 1994. P. 1—5.

[ii] *Bjork R.* Conceptions of National History // Conceptions of National History: Proceedings of Nobel Symposium. Stockholm : Walter de Gruyter, 1994. P. 5—14. C. 6.

[iii] *Bjork R.* Conceptions of National History // Conceptions of National History: Proceedings of Nobel Symposium. Stockholm : Walter de Gruyter, 1994. P. 5—14. C. 5-7.

[iv]*Smith A. D.* Gastronomy or Geology? The Role of Nationalism in the Reconstruction of Nations // Nations and Nationalism. 1994.№ 1. P. 3—23. C. 19.

[v] *Chahin M.* The Kingdom of Armenia : A History. Routledge, 2001. C. 45-52.

[vi] Очерки по истории государственности Узбекистана / ред. Д. Алимова, Э.Ртвеладзе. Ташкент : ИПАК «Шарк», 2001. С. 5.

[vii] *Ферро М.* Как рассказывают историю детям в разных странах мира. М.: Высш. шк.,1992. С. 4.

[viii] *Козлов В. И.* Этнос. Нация. Национализм. Сущность и проблематика. М. : Старый Сад, 1999. С. 179-200.

[ix] *Wood G. S.* The Creation of the American Republic, 1776—1787.University of North Carolina Press, 1969.